УДК 821.111 (73) 09 “19/20” (092)

# Роля аповедаў выжывання ў творчасці Леслі Марман Сілка

Радзіеўская В.А.
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

Леслі Марман Сілка (Lesli Marmon Silko, 1948) – амерыканская пісьменніца індзейскага паходжання (племя Лагуна Пуэбла), аўтар раманаў “Абрад” (1977), “Альманах мёртвых” (1991), “Сады ў дзюнах” (2000), некалькіх зборнікаў вершаў і апавяданняў (“Жанчыны племені Лагуна” (1974), “Распавядальнік гісторый” (1981) і інш.), кнігі мемуараў “Бірузовы пласт” (2010), аповесці “Аповед акіяна” (2011).

Творы Л. М. Сілка накіраваныя на пошук ідэнтычнасці сучаснага індзейца, якая фармуецца ва ўмовах вяртання да нацыянальных каштоўнасцяў, амерыканскай рэальнасці і глабалізма. Дзякуючы выкарыстанню індзейскіх сюжэтаў, сімволікі, мастацкіх прыёмаў, пісьменніца спалучае класічную літаратурную форму і вусную традыцыю.

Аповеды выжывання з’яўляюцца адным з найважнейшых мастацкіх прыёмаў Л. М. Сілка. Яны ўводзяцца ў тканіну твораў праз расповед (storytelling) і ўплываюць на развіццё сюжэта і вобразную сістэму. У залежнасці ад крыніцы аповеды выжывання ў творчасці Л. М. Сілка падзяляюцца на міфалагічныя (гісторыі індзейскіх багоў і герояў), гістарычныя (прыклады супрацьстаяння белым каланістам), сямейныя або родавыя (пэўны варыянт міфаў і легенд, які распавядаўся роднымі і сваякамі пісьменніцы) і сюжэтныя. Усе вышэй пералічаныя тыпы аповедаў звязаныя з вобразам трыкстара – блазна і хітруна. У адпаведнасці са сферай жыцця чалавека можна выявіць наступныя ўзроўні аповедаў: прыродны (выжыванне у складаных кліматычных умовах), персанальны (паспяховы пошук ідэнтычнасці і свайго месца ў свеце), грамадскі (развіццё індзейскай супольнасці ў ЗША) і культурны (пераадоленне грэблівага стаўлення да культуры карэнных народаў). Важнае значэнне пры выкарыстанні аповедаў выжывання мае іх паралелізм і сінкрэтызм. Міфалагічная або гістарычная лінія абумоўлівае сюжэтную, грамадскае або культурнае адраджэнне звязана з прыродным і персанальным і г.д.

Такім чынам, аповеды выжывання ў творчасці Л. М. Сілка выконваюць наступную ролю: вызначаюць усе сферы жыцця чалавека (прыродную, персанальную, грамадскую, культурную); звяртаюцца да паспяховых прыкладаў існавання культуры ў міфалагічным, гістарычным, сямейным і персанальным вымярэннях, увасабляючы яе моц і эфектыўнасць; накіроўваюць сучасных індзейцаў у пошуках ідэнтычнасці, заснаванай на сумяшчэнні традыцыйных каштоўнасцяў і выклікаў нашага часу.